# Беларуская мова і літаратурнае чытанне
# Алімпіядныя заданні

## II клас

**Заданне 1.**
Запішы назвы жывёл у алфавітным парадку *(6 б.)*.
Ліса, вавёрка, лось, рысь, дзік, мядзведзь.

**Заданне 2.**
Складзі слова, у якім:
першая літара стаіць за **Ч**,
другая літара — перад **Л**,
трэцяя — паміж **Н** і **П**,
чацвёртая — за **К**,
пятая — гэта першая літара алфавіта *(2 б.)*.

**Заданне 3.**
Выпішы словы, якія абазначаюць адзенне *(па 1 б.)*.
Ручнік, камізэлька, спадніца, сукенка, сурвэтка, капялюш, панчохі, акуляры.

**Заданне 4.**
Адгадайце загадкі *(па 2 б.)*.
Я зверху круглы ды зялёны,
Унутры салодкі ды чырвоны.
(падказка: к, н, а, в, у)

На градцы — доўгі і зялёны,
А ў дзежцы — мокры ды салёны.
(падказка: г, р, к, о, у, а)

**Заданне 5.**
Выпішы словы, якія маюць 6 гукаў *(па 1 б.)*.
Елка, поўнач, акіян, сняжок, дзядок, моладзь.

**Заданне 6.**
Падумай, з якой літары трэба пісаць выдзеленыя словы. Спішы сказ, раскрываючы дужкі *(па 1 б.)*.
Для сястрычкі **(П,п)олі** васількоў букецік я нарваў у **(П,п)олі.**

**Заданне 7.**
Падкрэслі словы, якія нельга пераносіць *(па 1 б.)*.
Восень, агонь, дождж, збожжа, Юра, воўк, сям'я, гульня, урок, просьба, пад'ём.

**Заданне 8.**
Пастаў націск у выдзеленых словах *(па 1 б.)*.
Дзед Ігара — **казак** з Кубані. Бабуля ведае многа **казак**.
**Каня** — драпежная птушка сямейства ястрабіных. У вёсцы няма **каня**.

**Заданне 9.**
Устаўце патрэбнае па сэнсе слова ва ўрывак з апавядання Алеся Бадака «Маленькі чалавек у вялікім свеце» *(3 б.)*.
А ўсё гэта — і лес, і рэчка, і зямля, па якой ты ходзіш, і горад, у якім ты жывеш, і вёска, у якой жывуць твае бабуля і дзядуля, — усё гэта разам называецца адным словам — ________________.

**Заданне 10.** Падкрэслі прозвішчы беларускіх пісьменнікаў *(па 1 б.)*.
А. Ліндгрэн, М. Багдановіч, А. Пушкін, Б. Захадэр, Я. Купала, Я. Колас.

***Адказы***

**1.** Вавёрка, дзік, ліса, лось, мядзведзь, рысь.
**2.** Школа.
**3.** Камізэлька, спадніца, сукенка, капялюш, панчохі.
**4.** Кавун, агурок.
**5.** Поўнач, акіян, сняжок.
**6.** Для сястрычкі **Полі** васількоў букецік я нарваў у **полі.**
**7.** Агонь, дождж, Юра, воўк, сям'я, урок.
**8.** Дзед Ігара — **казак** з Кубані. Бабуля ведае многа **казак**.
**Каня** — драпежная птушка сямейства ястрабіных. У вёсцы няма **каня**.
**9.** Радзіма.
**10.** А. Ліндгрэн, М. Багдановіч, А. Пушкін, Б. Захадэр, Я. Купала, Я. Колас.

---

**Заданне 1.**
Перакладзі на беларускую мову *(па 1 б. за слова)*.

| | |
|---|---|
| рубашка | ковёр |
| путешествие | платье |
| юбка | вторник |

**Заданне 2.**
Пастаў словы ў множны лік *(па 1 б. за слова)*.

| | |
|---|---|
| акно | возера |
| сябар | поле |
| чалавек | вока |

**Заданне 3.**
Знайдзі і падкрэслі ў кожным радку лішняе слова *(па 1 б. за слова)*.
Страх, страха, страшыць, страшны.
Рака, рачны, рак, рачулка.
Голас, галасісты, галасок, гол, галасаваць.
Горад, гарадскі, гара, гарадок.

**Заданне 4.**
Раздзялі словы на склады. З першых складоў кожнага слова на адным радку складзі і запішы новае слова *(па 2 б. за слова)*.

Маліна, шыпы, народ
Даўні, жыта, нярэдка
Чабор, роўны, нырраць

**Заданне 5.** Правільна запішы сказ *(па 1 б. за кожнае слова).*

Нас талазі ма. Вып аўснег. Лёдск а ваўрэ кі.

**Заданне 6.**

Запішы імёны людзей, ад якіх утварыліся наступныя прозвішчы *(па 1 б. за слова)*.

| | |
|---|---|
| Сямёнаў | Фёдараў |
| Сцяпанаў | Мікалаеў |
| Ягораў | Максімаў |
| Макараў | Барысаў |

**Заданне 7.**

Па малюнках адгадай крыжаванку. Выпішы слова, якое атрымалася ў выдзеленым слупку *(па 1 б. за кожнае слова, 1 б. за адказ).*







**Заданне 8.**

Рашы слоўнікавыя задачкі. Запішы словы, якія атрымаліся *(1–2 па 1 б.; 3–4 па 1,5 б.)*.

1) Сліва – ва + мак =
2) Малаток – ток + дзед – д + ц =
3) Замок – мок + газ – з + д + каша – ша =
4) Пар – р + друк – к + ч + ніз – з + к =

**Заданне 9.**

Адгадай рэбусы *(па 2 б.)*

1. 

2. 

3. 

**Заданне 10.**

Да якога фальклорнага жанру адносяцца гэтыя радкі? Абвядзі літару з правільным адказам *(2 б.).*

| | |
|---|---|
| Пятро, Пятро, | А) песня |
| Падай вядро. | Б) лічылка |
| Карове піць — | В) калыханка |
| Табе журыць. | |

***Адказы***

**1.** Кашуля, падарожжа, спадніца, дыван, сукенка, аўторак.
**2.** Вокны, сябры, людзі, азёры, палі, вочы.
**3.** Страх, <u>страха</u>, страшыць, страшны.
Рака, рачны, <u>рак</u>, рачулка.
Голас, галасісты, галасок, <u>гол</u>, галасаваць.
Горад, гарадскі, <u>гара</u>, гарадок.
**4.** **Ма**ліна, **шы**пы, **на**род — машына.
**Даў**ні, **жы**та, **ня**рэдка — даўжыня.
**Ча**бор, **роў**ны, **ны**раць — чароўны.
**5.** Настала зіма. Выпаў снег. Лёд скаваў рэкі.
**6.** Сямён, Сцяпан, Ягор, Макар, Фёдар, Мікалай, Максім, Барыс.
**7.**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | | | **а** | г | у | р | о | к |
| 2. | | ц | ы | б | у | **л** | я | | | | |
| 3. | | | | | | **ф** | а | с | о | л | я |
| 4. | | | | | г | **а** | р | б | у | з | |
| 5. | | м | о | р | к | **в** | а | | | | |
| 6. | | | п | а | м | **і** | д | о | р | | |
| 7. | к | а | п | у | с | **т** | а | | | | |

Адказ: АЛФАВІТ.
**8.**
1) Слімак.
2) Маладзец.
3) Загадка.
4) Падручнік.
**9.** Стоўб. Рака. Ток.
**10.** Лічылка.

# III клас

**Заданне 1.**

Вызначы, колькі слоў у сказе, абвядзі літару с правільным адказам. Запішы сказ правільна. Падкрэслі галоўныя члены сказа *(па 1 б. за кожнае слова; 1 б. за выбар адказу; па 0,5 б. за кожны член сказа).*

Надлесамвышэйпаднялосясонцаіўсміхнуласяязямлі.
А) 10; Б) 7; В) 8; Г) 6.

**Заданне 2.**

Размяркуй словы ў асобныя слупкі. Падпішы кожны слупок *(па 1 б. за слова; па 1 б. за класіфікацыю).*

Дарога, зімаваць, снежань, папера, маляваць, блакітны, аловак, восеньскі, смяяцца, вясёлы, усмешка, ранішні, крычаць.

**Заданне 3.** Да слоў з левай калонкі падбяры і запішы слова з супрацьлеглым значэннем з правай калонкі *(па 1 б. за слова)*.

| | |
|---|---|
| Вялікі — __________ | глыбокі, далёкі, малы |
| Глуха — __________ | адзінока, звонка, ціха |
| Далёка — __________ | блізка, высока, хутка |
| Працавіты — ________ | дзелавы, лянівы, працаздольны |

**Заданне 4.** Далучы прыстаўкі да дзеяслова *ехаць* і запішы ўтвораныя словы *(па 1 б. за слова).*




**Заданне 5.**

Замяні дадзеныя выразы адным словам, запішы *(па 1 б. за слова)*.

1) вучань першага класа.
2) той, хто вучыцца або вучыўся ў адным класе.
3) той, хто працуе на будаўніцтве.
4) той, хто займаецца пчалярствам.
5) той, хто ўмее рабіць і рамантаваць печы.

**Заданне 6.**

Злучы словы так, каб атрымаліся фразеалагічныя зварот *(па 2 б.).*

| | |
|---|---|
| кітайская | лета |
| парахавая | іскра |
| бабіна | душа |
| шчодрая | бочка |
| божая | грамата |

**Заданне 7.**

Адгадай загадку-анаграму. Запішы адказ *(па 2 б. за слова).*

Яна да мора цягнецца заўжды,
Бяжыць, віляючы, управа, улева...
Ледзь перастаў склады і вось тады
Адразу стане часткай дрэва.

**Заданне 8.**

Дапішы канчаткі прыметнікаў *(па 1 б. за слова).*

| | |
|---|---|
| залат___ медаль | зл___ сабака |
| салдацк___ шынель | нясцерпн___ боль |
| смачн___ яблык | бел___ гусь |

**Заданне 9.**

Запішы словы, што перададзены гукамі *(па 2 б. за слова).*

[йама] [с'амйа] [йул'ійа] [л'ук]

**Заданне 10.**

Пра якую кветку гаворыцца ў вершаванай загадцы М. Пазнякова? Адзнач літару з правільным адказам *(2 б.).*

Гарачае лета, спеюць суніцы,
А ён у пуховай хусцінцы.

А) званочак;
Б) ландыш;
В) цюльпан;
Г) нарцыс;
Д) дзьмухавец.

***Адказы***

**1.** Над лесам вышэй паднялося сонца і ўсміхнулася зямлі.

В) 8.

**2.**

| | | |
|---|---|---|
| дарога | зімаваць | блакітны |
| снежань | маляваць | восеньскі |
| папера | смяяцца | вясёлы |
| аловак | крычаць | ранішні |
| усмешка | | |
| **Гэта назоўнікі.** | **Гэта дзеясловы.** | **Гэта прыметнікі.** |

**3.** Вялікі — малы.
Глуха — звонка.
Далёка — блізка.
Працавіты — лянівы.

**4.** Пад'ехаць, аб'ехаць, уз'ехаць, ад'ехаць, паехаць, з'ехаць, заехаць, прыехаць.

**5.**
1) першакласнік.
2) аднакласнік.
3) будаўнік.
4) пчаляр.
5) пячнік.

**6.**

| | |
|---|---|
| кітайская | лета |
| парахавая | іскра |
| бабіна | душа |
| шчодрая | бочка |
| божая | грамата |

**7.** Рака — кара.

**8.**

| | |
|---|---|
| залат**Ы** медаль | смачн**Ы** яблык |
| салдацк**І** шынель | нясцерпн**Ы** боль |
| бел**АЯ** гусь | зл**Ы** сабака |

**9.** Яма, сям'я, Юлія, люк.

**10.** Д) дзьмухавец.

---

**Заданне 1.**

Расшыфруй і запішы запавет Кузьмы Чорнага дзецям. Дапаможа табе ў гэтым добрае веданне алфавіта *(12 б.).*

| | | | |
|---|---|---|---|
| Б — ну | Ж — уж | М — е | Т — ва |
| Я — ка. | Ч — ёс | А — Ша | Ё — др |
| Л — ма | С — і | Ц — то | Ю — ве |
| В — й | Г — це, | З — бу: | І — гэ |
| Й — та | Д — дзе | Е — ці, | К — са |
| Н — да | У — ж | Ш — ць | О — ра |
| Ў — на | Ы — у | П — го | Ф — е, |
| Ь — ча | Р — е | Х — ш | Э — ла |

**Заданне 2.**

У кожным радку зашыфравана назва краіны і яе сталіца. Знайдзі заканамернасць і расшыфруй гэтыя назвы *(па 1 б. за слова).*

М Я А І С С К І А В Р А
І Г С Р І У Л З І І Б Я Т

**Заданне 3.**

Запішы імёны дзяўчынак, якія схаваліся ў слове ЦАЛІНА. Літары перастаўляць нельга *(па 1 б. за слова).*

**Заданне 4.**

Да скарочаных імёнаў падбяры поўныя і запішы іх *(па 1 б. за слова).*

Алёша, Жэня, Валік, Сцёпа, Саша, Света.

**Заданне 5.**

Адгадай зашыфраванае слова і запішы яго *(па 2 б. за слова).*

1) С + месца, дзе стаяць караблі =

2) У + твор пра чарадзейныя падзеі =

3) Кавалак – ак + ь =

**Заданне 6.**

Дапоўні сказы словамі з супрацьлеглым значэннем *(па 2 б. за сказ).*

Зімой дні ___________, а летам ___________ .

Рыхтуй сані __________, а калёсы ___________ .

У казках заўсёды _______ перамагае _______ .

**Заданне 7.**

Якое значэнне маюць дадзеныя фразеалагізмы? Пакажы стрэлкамі *(па 1 б.).*

| | |
|---|---|
| Стаяць над душой | зладжана |
| У адзін голас | дакучаць |
| Вадзіць за нос | не звяртае ўвагі |
| І вухам не вядзе | абяцаць і не выконваць |

**Заданне 8.**

Складзі новыя словы, узяўшы з кожнага слова ў табліцы пазначаную частку *(па 4 б. за слова).*

| ⏋ | ⌒ | ∧ | □ | Новыя словы |
|---|---|---|---|---|
| паход | беленькі | ночка | лета | |
| падкінуў | казаць | рыбка | зіма | |

**Заданне 9.**

Да якога фальклорнага жанру адносяцца гэтыя радкі? Абвядзі літару з правільным адказам *(2 б.).*

Пятро, Пятро,
Падай вядро.
Карове піць —
Табе журыць.

А) Песня; Б) Лічылка; В) Калыханка.

**Заданне 10.**

Устаў прапушчаныя літары *(па 1 б. за слова).*

Спевы — сп..ваць, сп..вак, сп..вакі.

Разгледзець — абгл..даць, гл..дач, гл..дачы.

Сёстры — с..стрычка, с..стрыца, с..стрыно.

Азёры — аз..рцо, аз..рышча, воз..ра.

Снег — сн..гі, сн..жынка, сн..гапад.

***Адказы***

**1.** Шануйце, дзеці, дружбу: гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека.

**2.** Расія, Масква.
Грузія, Тбілісі.

**3.** Аліна, Ліна, Іна.

**4.** Аляксей, Яўген (Яўгенія), Валянцін, Сцяпан, Аляксандр (Аляксандра), Святлана.

**5.** Спорт, указка, каваль.

**6.** Зімой дні **кароткія (халодныя, студзёныя, ...)**, а летам **доўгія (цёплыя, гарачыя, ...)**.

Рыхтуй сані **летам (улетку)**, а калёсы **зімой (узімку)**.

У казках заўсёды **дабро** перамагае **зло**.

**7.**

Стаяць над душой → дакучаць
У адзін голас → зладжана
Вадзіць за нос → абяцаць і не выконваць
І вухам не вядзе → не звяртае ўвагі

**8.**

| ⏋ | ⌒ | ∧ | □ | Новыя словы |
|---|---|---|---|---|
| паход | беленькі | ночка | лета | **пабелка** |
| падкінуў | казаць | рыбка | зіма | **падказка** |

**9.** Б) Лічылка.

**10.** Спевы — сп**Я**ваць, сп**Я**вак, сп**Е**вакі.
Разгледзець — абгл**Я**даць, гл**Я**дач, гл**Е**дачы.
Сёстры — с**Я**стрычка, с**Я**стрыца, с**Е**стрыно.
Азёры — аз**Я**рцо, аз**Я**рышча, воз**Е**ра.
Снег — сн**Я**гі, сн**Я**жынка, сн**Е**гапад.

# IV клас

**Заданне 1.**

Запішы па парадку літары алфавіта, якія адсутнічаюць у кожным радку. Складзі з гэтых літар словы, запішы іх *(па 2 б. за слова).*

1) А Б В Г Д Е Ё Ж З І Й К Л М П Р С У Ў Ф Х Ц Ч Ш Ь Э Ю Я;

2) А Б В Д Е Ё Ж З І Й К Л М Н П С Т У Ў Ф Х Ц Ч Ш Ь Э Ю Я;

3) А В Г Д Е Ё Ж З І Й К Л М Н П С Т У Ў Ф Х Ц Ч Ш Ы Ь Э Ю Я;

4) А Б В Г Д Е Ё Ж З І Й К М Н П Р Т У Ў Ф Х Ц Ч Ш Ы Э Ю Я.

**Заданне 2.**

Разгадай шараду, запішы словы *(па 2 б. за слова).*

Каб частка судна ды імем стала,
Не будзь марудны — работы мала:
Ану, мой дружа малады,
Вазьмі і перастаў склады!

**Заданне 3.**

Падбяры да рускіх словазлучэнняў аднаслоўныя беларускія адпаведнікі, запішы іх *(па 2 б. за слова).*

1) гнездо аиста.

2) блины из тёртого картофеля.

3) тёплые страны, куда летят зимовать перелётные птицы.

4) подсолнечное масло.

5) книжный магазин.

**Заданне 4.**

Запішы назву ўстановы, у якой ужываюцца прыведзеныя словы *(па 2 б. за слова).*

1) Рэгістратура, пацыент, тэрапеўт, стаматолаг, прышчэпка.

2) Жанглёр, клоўн, дрэсіроўшчык, фокус, акрабат.

3) Пасылка, адрас, канверт, марка, штэмпель.

**Заданне 5.**

Утвары ад слоў формы адзіночнага ліку *(па 1 б. за слова).*

Азёры, восы, коп'і, рэйкі, стрэхі, рэкі.

**Заданне 6.**

Злучы супрацьлеглыя па значэнні фразеалагізмы *(па 1 б.).*

| | |
|---|---|
| Хоць іголкі збірай | Расце ў роце |
| Хоць касой касі | Як кот з сабакам |
| Язык праглынеш | Хоць вока выкалі |
| Душа ў душу | Як кот наплакаў |

**Заданне 7.**

Складзіце словазлучэнні па схемах *(па 3 б.).*

1) дзеяслоў + назоўнік у Р. скл. з прыназоўнікам **да**.

2) дзеяслоў + назоўнік у М. скл. з прыназоўнікам **аб**.

3) дзеяслоў + назоўнік у Т. скл. з прыназоўнікам **з**.

**Заданне 8.**

Змяні сказы так, каб яны сталі пабуджальнымі *(па 2 б.).*

Дзеці майстравалі шпакоўні.

Ганначка малявала блакітную пралеску.

**Заданне 9.**

Пастаў назоўнікі ў месным склоне *(па 1 б.).*

Муха — аб __________, ліха — аб __________, снег — на ___________, сцяг — аб __________, біклага — у __________, парог — на ___________, бег — аб ________, рог (жывёлы) — на ________ .

**Заданне 10.** У некаторых казках выкарыстоўваецца выраз «Вам казка, а мне абаранкаў вязка». Адзнач, чым ён з'яўляецца *(2 б.).*

1) Зачын;

2) самы напружаны момант;

3) паўтор дзеяння;

4) канцоўка;

5) характарыстыка герояў.

### *Адказы*

**1.** 1) ноты, тоны; 2) горы; 3) бор; 4) лось, соль.

**2.** Карма, Макар.

**3.** 1) буслянка; 2) дранікі; 3) вырай (поўдзень); 4) алей; 5) кнігарня.

**4.** 1) паліклініка (бальніца); 2) цырк; 3) пошта.

**5.** Возера, аса, кап'ё, рэйка, страха, рака.

**6.**

Хоць іголкі збірай — Хоць вока выкалі
Хоць касой касі — Як кот наплакаў
Язык праглынеш — Як кот з сабакам
Душа ў душу — Расце ў роце

**7.**

1) Дабег да дрэва; 2) напісаў аб вёсцы; 3) гуляў з сябрам.

*Словазлучэнні могуць быць іншыя.

**8.** Дзеці, майструйце шпакоўні!

Ганначка, намалюй блакітную пралеску!

**9.** Аб мусе, аб ліху, на снезе, аб сцягу, у біклазе, на парозе, аб бегу, на розе.

**10.** 4) канцоўка.

---

**Заданне 1.**

Складзі і запішы слова *(па 0,5 б. за частку слова).*

Корань, як у слова ***стрымліваючы***;

прыстаўка, як у слова ***падбярозавік***;

канчатак, як у слова ***вада***;

суфікс, як у слова ***ночка***.

**Заданне 2.**

Размяркуй назоўнікі ў тры слупкі. Падпішы кожны слупок *(па 1 б. за слова; па 1 б. за класіфікацыю).*

Вярба, пень, жыццё, рысь, чытанне, таполя, пальма, звон, даль, мыш, здарэнне, матуля, дупло, шчырасць, моладзь.

| ***Назва:*** | ***Назва:*** | ***Назва:*** |
|---|---|---|

**Заданне 3.**

*Падбяры і запішы антонімы (па 1 б. за слова).*

1) добры.

2) цяжкі.

3) рэдкі.

4) холад.

5) згубіць.

**Заданне 4.**

Якая прыказка зашыфравана лічбамі, што абазначаюць месца пэўнай літары ў беларускім алфавіце? Абвядзі літару з правільным адказам *(3 б.).*

5, 28, 14, 21, 2, 6, 9, 1, 4, 15, 31, 15, 6, 2, 28, 3, 1, 6.

А) У розуму тысячы вачэй.

Б) Дзе веды, там і смеласць.

В) Дыму без агню не бывае.

Г) Агонь агнём не тушаць.

**Заданне 5.**

Пастаў назоўнікі ў патрэбным склоне, склон запішы ў дужках *(па 1 б. за слова; па 1 б. за склон).*

Рака — у ________ ( ___ ) .

Нага — на ________ ( ___ ) .

Печ — за ________ ( ___ ) .

Горад — у ________ ( ___ ) .

Гараж — у ________ ( ___ ) .

Страха — на ________ ( ___ ) .

**Заданне 6.**

Устаў у прыказкі словы з процілеглым значэннем. Першае слова бяры з падказкі, другое — прыдумай сам *(па 1 б. за першае слова, па 2 б. за другое слова).*

Калі будзе __________ , будзе і ___________ .

__________ зямля _____________ рук не любіць.

____________ гавары, _______________ слухай.

___________ будуе, а ______________ руйнуе.

***Падказка:*** пачатак, мір, чорная, менш.

**Заданне 7.** Разгледзь «чароўны квадрат». У ім па гарызанталі і па вертыкалі схаваны назвы прысмакаў. Адшукай і запішы іх *(па 2 б. за слова).*

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| П | Я | Ч | Э | Н | Н | Е |
| П | О | З | І | П | К | А |
| Г | Б | Ю | З | І | У | В |
| Ц | У | К | Е | Р | К | А |
| Ш | Д | В | Ф | О | Ц | Ф |
| М | Ё | Д | І | Г | Й | Л |
| Н | Ш | Ф | Р | Е | Ь | І |

**Заданне 8.**

Запішы словы, якія пачынаюцца з літары ***с*** і абазначаюць *(па 2 б.)*:

невялікі вадаём

востраў на Далёкім Усходзе

від адзення

назву месяца

насякомага-шкодніка

другога аўтара твора

**Заданне 9.**

З кожнай пары слоў складзі назоўнік, перастаўляючы літары або склады. Выкарыстаць трэба ўсе літары *(па 2 б. за слова).*

1) жар + канава =

2) бал + кажан =

3) саха + рама =

4) сала + па =

5) лена + рыба =

**Заданне 10.**

Адзнач, да якой часткі тэксту адносіцца гэты ўрывак. Абвядзі літару з правільным адказам *(2 б.).*

У дзяцінстве яна чула ад бабулі, што трэба сказаць чарадзейнае слова і павіснуць уніз галавой. І тады могуць вырасці крылы. Так яна і зрабіла.

1) пачатак;

2) асноўная частка;

3) канцоўка.

***Адказы***

**1.** Падтрымка.

**2.**

| ***Назва: 1-е скл.*** | ***Назва: 2-е скл.*** | ***Назва: 3-е скл.*** |
|---|---|---|
| вярба | пень | рысь |
| тапаля | жыццё | даль |
| пальма | чытанне | мыш |
| матуля | звон | шчырасць |
| | здарэнне | моладзь |
| | дупло | |

**3.**

1) Добры — злы.

2) Цяжкі — лёгкі.

3) Рэдкі — густы.

4) Холад — цяпло.

5) Згубіць — знайсці.

*Залічваюцца ўсе варыянты.*

**4.** В) Дыму без агню не бывае.

**5.**

Рака — у рацэ (М. с.).

Нага — на назе (М. с.).

Печ — за печчу (Т. с.).

Горад — у горадзе (М. с.).

Гараж — у гаражы (М. с.).

Страха — на страсе (М. с.).

**6.**

Калі будзе **пачатак**, будзе і **канец**.

**Чорная** зямля **белых** рук не любіць.

**Менш** гавары, **больш** слухай.

**Мір** будуе, а **вайна** руйнуе.

**7.**

Пячэнне, мёд, цукерка, вафлі, зефір, пірог.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| П | Я | Ч | Э | Н | Н | Е |
| П | О | З | І | П | К | А |
| Г | Б | Ю | З | І | У | В |
| Ц | У | К | Е | Р | К | А |
| Ш | Д | В | Ф | О | Ц | Ф |
| М | Ё | Д | І | Г | Й | Л |
| Н | Ш | Ф | Р | Е | Ь | І |

**8.** Сажалка, Сахалін, сукенка (спадніца), снежань (сакавік), саранча, суаўтар.

*Залічваюцца ўсе варыянты.*

**9.** Жаваранак; баклажан; расамаха; паласа; балерына.

**10.** 2) Асноўная частка.

***В. В. Чарнушэвіч****, метадыст аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі НІА, настаўніца пачатковых класаў, кіраўнік метадычнага аб’яднання настаўнікаў пачатковых класаў гімназіі № 22 г. Мінска*